# РЭЛІГІЙНЫ СІНКРЭТЫЗМ РЫМСКАЙ ІМПЕРЫІ Ў ПРАЦАХ АЙЧЫННЫХ І ІТАЛЬЯНСКІХ ГІСТОРЫКАЎ (2-АЯ ПАЛОВА ХХ – ПАЧ. ХХІ ст.)

*С. М. Смірноў*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці 4. 220030. г. Мінск, Беларусь; viales89@gmail. com*

Артыкул прадстаўляе агульны агляд дасягненняў італьянскай і беларускай гістарычнай навукі ў даследаванні рэлігійнага сінкрэтызму Рымскай імперыі ІІІ ст. н. э. Асноўная ўвага звернута на даследаванні шматлікіх аспектаў рэлігійнай гісторыі рымскага свету ў працах італьянскіх і беларускіх гісторыкаў

***Ключавыя словы:*** Рымская імперыя; рэлігійны сінкрэтызм; італьянская і беларуская гістарыяграфія; рымская рэлігія.

# РЕЛИГИОЗНЫЙ СИНКРЕТИЗМ РИМСКОЙ ИМПЕРИИ В ПРОИЗВОДСТВАХ ОТЕЧЕСТВЕННЫХ И ИТАЛЬЯНСКИХ ИСТОЧНИКОВ (2-Я ПОЛОВИНА ХХ – НАЧАЛО ХХІ ВЕКА)

*С. М. Смирнов*

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030. Минск, Беларусь; viales89@gmail. com*

В статье представлен обзор достижений итальянской и белорусской исторической науки в изучении религиозного синкретизма Римской империи III века н. э. Основное внимание уделяется изучению многих аспектов религиозной истории римского мира в трудах итальянских и белорусских историков.

***Ключевые слова:*** Римская империя; религиозный синкретизм; Итальянская и белорусская историография; Римская религия.

# RELIGIOUS SYNCRETISM IN THE ROMAN EMPIRE IN THE STUDIES OF ITALIAN AND BELARUSIAN HISTORIANS (2nd HALF XX – BEGINNING XXI CENTURY)

*S. M. Smirnou*

*Belarusian State University, Niezaležnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Republick of Belarus; viales89@gmail. com*

This article provides an overview of the achievements of Italian and Belarusian historical science in the study of religious syncretism in the Roman Empire of the third century AD. The main attention is paid to the study of various aspects of the religious history of the Roman world in the scientific works of Italian and Belarusian historians.

***Key words:*** Roman Empire; religious syncretism; Italian and Belarusian historiography; Roman religion.

Дадзены артыкул прысвечаны агульнаму разгляду асноўных думак і падыходаў італьянскай і айчыннай гістарыяграфіі другой паловы XX і пачатку XXI ст. да гісторыі рэлігійнага сінкрэтызму ў Рымскай імперыі III ст. н. э. Гістарыяграфія па дадзенай праблеме прадстаўлена шматлікімі працамі, у якіх асвятляюцца аспекты рэлігійнага сінкрэтызму ў духоўнай культуры Старажытнага Рыму. Італьянскія і беларускія гісторыкі разглядалі развіццё рэлігійна-філасофскай думкі ў першыя стагоддзі існавання Рымскай імперыі, узаемадзеянне язычнікаў і хрысціян, становішча ўсходніх містычных культаў, развіццё лакальных культаў і культу імператара ў рымскіх правінцыях, рэлігійную палітыку і прапаганду рымскіх імператараў. Таксама звярталася пэўная ўвага на праблему высвятлення сутнасці рэлігійнага сінкрэтызму як з'явы духоўнай культуры, а таксама прычыны яго ўзнікнення і разгортвання ў сацыяльнай і культурнай прасторы Рымскай імперыі.

Сярод даследчыкаў гісторыі антычнага свету пасляваеннай Італіі вызначаліся гісторыкі А. Мамільяна і С. Мадзарына. У сваёй працы па агульнай гісторыі Старажытнага Рыму А. Мамільяна звяртае ўвагу на рэлігійнае жыцце Рымскай імперыі. Гісторык падрабязна апісвае духоўную культуру эпохі прынцыпату, падкрэслівае крызісныя з'явы ў афіцыйнай рымскай рэлігіі. Крызісныя тэндэнцыі рымскага язычніцтва тлумачыць ростам уплыву ўсходніх містычных культаў і арыенталізацыю рымскай рэлігіі [24, p. 203–204]. Гэтыя тэндэнцыі былі выкліканы распадам антычнай грамады, ростам магутнасці рымскай дзяржавы і імператарскай улады. Таму духоўныя пошукі насельніцтва Рымскай імперыі з'яўляліся спробай прымірэння з неспрыяльнай сацыяльна-палітычнай рэчаіснасцю. На думку італьянскага гісторыка, антычная філасофская думка адыграла значную ролю ў гісторыі рэлігійнага жыцця імперыі. Але філасофскія вучэнні эпохі прынцыпату былі распаўсюджаны толькі сярод прадстаўнікоў інтэлектуальнай эліты Старажытнага Рыма. А. Мамільяна заўважае сінкрэтычныя рысы ў развіцці імператарскага культу, які фарміраваўся пад уплывам культаў эліністычных цароў [24, p. 204]. Рэлігійная палітыка рымскіх імператараў таксама адлюстроўвае агульны стан рэлігійнага жыцця імперыі [24, p. 215].

Агульнае апісанне рэлігійнай сітуацыі I–III стст. н. э прысутнічае ў працы італьянскага гісторыка С. Мадзарына. Даследчык адстойвае думку, што стасункі паміж хрысціянствам і язычніцтвам насілі не толькі канфрантацыйны характар, паміж рэлігійнымі сістэмамі адбываўся пэўны дыялог [23, p. 437–438]. Італьянскі гісторык падкрэслівае сінкрэтычныя

тэндэнцыі ў рэлігійнай палітыкі імператараў Элагабала і Аўрэліяна. Прыкладам рэлігійнай цярпімасці і падтрымкай сінкрэтызму, на думку С. Мадзарына, з’яўляецца рэлігійная палітыка Аляксандра Севера [23, p. 445–448, 451–470].

На думку італьянскага даследчыка Г. Кліментэ, сінкрэтычныя тэндэнцыі ў рэлігійным жыцці імперыі былі абумоўлены міжкультурнымі кантактамі, якія адбываліся ў гарадах рымскіх правінцый, а таксама ў рымскіх войску. Характэрнай рысай рэлігійнай сітуацыі ІІІ ст. н. э. італьянскі гісторык лічыць сувязь паміж культам імператара і салярнай тэалогіяй. Рэлігійную рэформу імператара Аўрэліяна звязвае з містычным культам Мітры. Звычайна італьянскія гісторыкі звязваюць культ Sol Invictus з сірыйскімі салярнамі культамі [24, p. 215]. Даследчык тлумачыць монатэістычныя тэндэнцыі ў рымскім язычніцтве пашырэннем рэлігійнага і культурнага сінкрэтызму на прасторах імперыі. На думку Г. Кліментэ, дадзеная тэндэнцыя лепш заўважна ў гісторыі развіцця хрысціянскага і язычніцкага гнастыцызму [13].

Падобных поглядаў на праблему рэлігійнай гісторыі рымскага свету прытрымліваецца Дж. А. Чэконі, які разглядае рэлігійны сінкрэтызм у Рымскай імперыі праз прызму міжэтнічных кантактаў і працэсаў раманізацыі насельніцтва рымскіх правінцый [12, p. 263–282].

Італьянскія даследчыкі паставілі пытанне аб недакладнасці класічнага падыходу да вывучэння гісторыі рымскай рэлігіі, які быў прадстаўлены ў працах Ф. Кюмона [3, с. 47–77]. Італьянскі гісторык У. Біянкі абгрунтоўвае неабходнасць кампаратыўных даследаванняў містэрыяльных культаў, якія маглі ўплываць адзін на аднаго і пераэжывалі пэўныя змены пад уплывам лакальных культаў [16, p. 1–17]. Даследчык падкрэслівае перспектыўнасць даследавання гісторыі язычніцкага і хрысціянскага гнастыцызму. Крытычныя заўвагі У. Біянкі падтрымалі даследчыкі Ф. Корэалі, М. Гвардуччы, Р. Волпе, якія разглядалі асаблівасці сакральнага мастацтва арыентальных культаў, аспекты магіі і сатэралогіі культаў Кібелы, Сабазія і Юпітэра Даліхенскага [16, p. 33–68; 123–126; 145–156]. Акрамя гэтага У. Біянкі распрацоўваў праблемы гісторыі рымскага мітраізму, элеўсінскіх і дыянісійскіх містэрый [17, p. 259–280].

Італьянская даследчыца Дж. Гаспара асвятляе трансфармацыю культу Кібелы і Аціса пад уплывам грэчаскай і рымскай рэлігіі. Яны лічыць, што фрыгійскі культ Кібелы першапачаткова не меў рыс містэрыяльнага культу. Пад уплывам грэчаскіх містэрый фрыгійскі культ трансфармаваўся і атрымаў свае містэрыі ў эліністычную эпоху. Культ Кібелы і Аціса ў

Рымскай імперыі мае яскравы сінкрэтычны характар, на думку італьянскай даследчыцы [14; 15, с. 56–64]. Праблемы гісторыі гнастыцызму, мітраізму і культу Добрай багіні асветлены ў працах А. Мастрачынкве [21; 22]. Італьянскі даследчык абгрунтоўвае думку аб значным ўплыве дыянісійскіх містэрый на культ Добрай багіні. У сваёй працы А. Мастрачынкве падкрэслівае гендарны аспект ў гісторыі рэлігійнага жыцця Рымскай імперыі [20, p. 50–52].

Гісторыю містэрыяльных культаў, рэлігійнай нецярпімасці закранаў сучасны італьянскі даследчык Э. Санцы [28, p. 29–53], які ўдзельнічаў разам з іншымі італьянскімі даследчыкамі ў складанні зборніка гістарычных крыніц па гісторыі арыентальных культаў [26]. Даследчыкі Э. Санцы і К. Сфамені апісваюць і аналізуюць монатэістычныя тэндэнцыі у развіцці арыентальных культах і гнастыцызму [29, p. 73–121]. К. Сфамені лічыць узаемадзеянне розных рэлігійных уяўленняў, магіі і антычнай філасофіі адной з прычын фарміравання монатэістычных тэндэнцый у рэлігійным жыцці рымскага свету. Італьянская даследчыца не абсалютызуе дадзеныя тэндэнцыі, але намагаецца падняць праблему тэарэтычнага разгляду гісторыі рэлігійнага жыцця ў Рымскай імперыі [29, p. 121–140].

На сучасным этапе італьянскія гісторыкі працягваюць даследаванні праблем рэлігійнай гісторыі Рымскага свету. Сярод сучасных даследчыкаў Італіі вылучаецца Р. Маркесіні, якая прадставіла працу аб усходніх культах у рымскай Осціі [19]. Праблему гісторыі салярнага культу Элагабала закранае Э. Бадарака [11]. Аспекты развіцця рэлігійнай думкі асвятляюцца даследчыкам Дж. Мускаліна [25]. Гісторыя містэрыяльных культаў і язычніцкага гнастыцызму распрацоўваецца даследчыкам П. Скарпі [18].

Асноўным дасягненнем італьянскай гістарыяграфіі з’яўляецца спроба дапоўніць і пашырыць класічны падыход Ф. Кюмона. Італьянскія гісторыкі прадставілі больш комплексны і сістэмны падыход да гісторыі рэлігійнай сітуацыі ў Рымскай імперыі. У сваіх даследаваннях яны разглядалі шматлікія аспекты гісторыі рэлігійнага сінкрэтызму і імкнуліся даць больш аб’ектыўную характарыстыку духоўнай культуры Старажытнага Рыму.

Праблема гісторыі духоўнай культуры і рэлігіі Рымскай імперыі цікавала прадстаўнікоў беларускай гістарычнай навукі. Айчынныя гісторыкі ў сваіх даследаваннях распрацоўвалі праблему фарміравання і развіцця хрысціянскай рэлігіі. Містэрыяльныя культы і рэлігійны

сінкрэтызм выступаў як агульны гістарычны фон фарміравання і развіцця хрысціянства ў рымскім свеце. Айчынная гістарыяграфія падрабязна не разглядала шматлікія аспекты гісторыі рымскай рэлігіі. Савецкая гістарычная навука не абмінала ўвагай гісторыю рымскага язычніцтва і агульнага стану рэлігійнай сітуацыі ў Рымскай імперыі [10].

Значны ўнёсак у беларускае антыказнаўства зрабіў прафесар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Г. М. Ліўшыц. Гісторык у сваіх даследаваннях закранаў праблему фарміравання хрысціянства, а таксама праблему міжкультурнага дыялогу яўрэйскай дыяспары і эліністычнага свету [2, с. 66–75; 7]. Апісанне рэлігійнага сінкрэтызму ў Рымскай імперыі прысутнічае ў яго грунтоўнай працы аб вытоках хрысціянства [4, с. 140–142]. Гілер Маркавіч падкрэслівае думку, што фарміраванне хрысціянскай рэлігіі было лагічным вынікамі культурных і рэлігійных кантактаў у антычным свеце [4, с. 200].

Дадзеную лінію даследавання рэлігійнага жыцця Старажытнага Рыму працягнулі даследчыкі В. І. Гарамыкіна і В. А. Фядосік. В. І. Гарамыкіна апісвае агульны рэлігійны стан Рымскай імперыі, звяртае ўвагу на рост папулярнасці арыентальных культаў у II–III ст. н. э [1, с. 22–23]. В. А. Фядосік закранае праблему развіцця хрысціянства, яго ўзаемадзеяння з язычніцтвам, рэлігійную палітыку рымскіх імператараў у адносінах да хрысціянскай царквы ў III ст. н. э [8; 9]. Далейшае даследаванне гісторыі ранняга хрысціянства працягнуў А. А. Тарканеўскі, які разглядае рэлігійны сінкрэтызм і пашырэнне арыентальных культаў у Рымскай імперыі як агульны культурны і рэлігійны фон развіцця хрысціянскай абшчыны ў Рыме эпохі прынцыпату [6, с. 56–81].

На сучасным этапе беларускія даследчыкі пачалі звяртаць увагу на гісторыю містэрыяльных культаў і рэлігійнага сінкрэтызму. Праблему гісторыі мітраізму і яго ўзаемадзеянне з хрысціянствам ў рымскай Брытаніі падымае сучасны беларускі даследчык А. І. Малюгін [5].

Сёння беларуская гістарычная навука можа звярнуцца да больш глыбокага даследавання праблемы рэлігійнай гісторыі Рымскай імперыі. Перад айчыннымі гісторыкамі адкрываецца перспектыўнасць вывучэння рэлігійнага сінкрэтызму і язычніцкіх форм рэлігійнага жыцця ў Старажытным Рыме. Досвед італьянскай гістарычнай навукі пацвярджае перспектыўнасць дадзенага накірункі гістарычных даследаванняў.

**Бібліяграфічны спіс**


1. Горемыкина В. И. В поисках истины о раннем христианстве. Минск: Беларусь, 1989.
2. Евтухов И. О. Кафедра истории древнего мира и средних веков. К 80-летию создания. Минск: БГУ. 2015.
3. Кюмон Ф. Восточные религии в римском язычестве. СПб.: Евразияб, 2002.
4. Лившиц Г. М. Происхождение христианства в свете рукописей Мертвого моря. Минск: Вышэйшая школа, 1967.
5. Малюгин О. И. Митраизм versus христианства в римской Британии: противостояние или конформизм // International Internet Conference «Control and Freedom in Antiquity», Perm, Russian Federation, 2008. URL: http://antiquity-perm.ru/?p=95.
6. Торканевский А. А. Христианство в Риме в I – середине II вв. Минск. Минская духовная академия, 2020.
7. Федосик В. А. Из истории становления белорусской научной школы античного христианства: запрещенная монография Г. М. Лившица // Роль университетского образования и науки в современном обществе: материалы междунар. науч. конф., Минск, 26–27 февр. 2019 г. Минск.: БГУ, 2019. С. 656–665.
8. Федосик В. А. Киприан и античное христианство. Минск: Университетское, 1991.
9. Федосик В. А. Церковь и государство: критика богословских концепций. Минск: Наука и техника, 1988.
10. Штаерман. Е. М. Социальные основы религии Древнего Рима. М.: Наука. 1987.
11. Badaracco E. Il culto del Deus Elagabalus dal I al III secolo d. C. Attraverso le testimonianze epigrafiche, letterarie e numistatiche. Tesi di dottorato. Sassari. Universita di Sassari, 2015.
12. Cecconi G. A. La città e l’impero: una storia del mondo romano dalle origini a Teodosio il Grande. Roma: Carocci editore, 2019.
13. Clemente G. Guida alla storia romana. Milano: Mondadori, 2017.
14. Gasparro G. S. I culti orientali in Sicilia. Leiden: E. J. Brill, 1973.
15. Gassparo G. S. Soteriology and mystic aspects in the cult of Cybele and Attis. Leiden: E. J. Brill, 1985.
16. La soteralogia dei culti orientali nell’Impero romano. Leiden: Brill, 1982.
17. Le civiltà del Mediterraneo e il sacro. V. 3. Milano: Jaca Book-Massimo, 1992.
18. Le religioni dei misteri. In 2 v. Roma: Fondazione Lorenzo Vallo; Mondadori, 2002.
19. Marchesini R. Sacra peregrina ad Ostia e Porto: Mithra, Iuppiter Sabazius, Iuppiter Dolichenus, Iuppiter Heliopolitanus. Roma: Sapienza Università di Roma, 2013.
20. Mastrocinque A. Bona Dea and the Cult of Roman Women. Stuttgart: Franz Steiner Verlag, 2014.
21. Mastrocinque A. From Jewish Magic to Gnosticism. Tübingen: Mohr Siebeck, 2005.
22. Mastrocinque A. The Mysteries of Mithra. Tübingen: Mohr Siebeck, 2017.
23. Mazzarino S. L'impero Romano. V. 2. Bari: Laterza, 2007.
24. Momigliano A. Manuale di storia romana. Novara; Torino: UTET. Universita, 2011.
25. Muscolino G. Porfirio: Il contro christianos una nuova edizione dei frammenti: tesi di dottorato. Salerno, 2009.
26. Sanzi E. I culti orientali nell'impero Romano. Un'antologia di fonti. Cosenza: Edizioni Linello Giordano, 2003.
27. Sanzi E. IVPPITER OPTIMVS MAXIMVS DOLICHENVS. Un «culto orientale» fra tradizione e innovazione riflessioni storico-relogiose. Roma: Lithos, 2013.

28. Sanzi E. Maghi sacerdoti santi. Un itinerario storico-religioso attraverso le «crisi» dei primi secoli della nostra era Roma: Lithos, 2015.
29. Sanzi E. Magia e culti orientali. Per la storia religiosa della tarda Antichita. Cosenza: Edizioni Lionello Giordano, 2009.